ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Цэнтральная бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

*«Беларусь! Зяленая, залатая!*
*Край мой светлы, што выпіў мора пакут!*
*Да апошняй бярозы бласлаўляю*
*Светлы дзень, што нарадзіўся тут»*

# БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДУ

## Віртуальная выстава

*да 90-годдзя з дня нараджэння*

## Уладзіміра Караткевіча







***Караткевіч У.С. – адзін з найбольш яскравых фігур у беларускай літаратуры 20 стагоддзя. Ён стаў першым беларускім пісьменнікам, які пачаў пісаць у жанры гістарычнага дэтэктыву.***

***Матэрыялы выставы знаёмяць з жыццём і багатай творчай спадчынай пісьменніка.***

# Біяграфія

Уладзімір Караткевіч нарадзіўся 26.11.1930 г. у горадзе Воршы Віцебскай вобласці ў сям`і служачага. У час ВАВ быў у эвакуацыі ў Пермскай вобласці, пасля ў Арэнбургу. У 1944 г. вярнуўся ў Воршу, атрымаў сярэднюю адукацыю. У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Кіеўскага ўніверсітэту. Настаўнічаў у вёсцы Лесавічы Тарашчанскага раёна Кіеўскай вобласці (1954-1956), у Воршы (1956-1958). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы (1960), Вышэйшыя Сцэнарныя курсы (1962) у маскве. З 1962 г. жыў у Менску. Вёў на тэлебачанні праграму «Спадчына» Караткевіч выступаў таксама як публіцыст і крытык. Працаваў як перакладчык.

Памёр 25.07.1984 г.

# Аўтабіяграфія



Уладзімір Караткевіч у дзяцінстве



Бацькі Уладзіміра Караткевіча – Надзея Васільеўна і Сямён Цімафеевіч



Аўтабіяграфія.

Я, Караткевіч Уладзімір Сямёнавіч, нарадзіўся 26 лістапада 1930 г. ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці, ў сям'і служачага. У 1938 годзе паступіў там жа, ў г. Орша, ў школу і да вайны скончыў тры класы. Пад час вайны быў у эвакуацыі ў Маскоўскай вобласці, а пасля ў г. Чкалаве. Пасля вызвалення роднага горада пераехаў у Оршу і паступіў у сёмы клас сярэдняй школы, якую скончыў у 1949 годзе. У камсамоле з 1945 года.

Пасля школы я паступіў у Кіеўскі універсітэт імя Т. Г. Шаўчэнкі, скончыў яго ў 1954 годзе, пасля чаго два гады працаваў вясковым настаўнікам ў в. Лесавічы, Таращанскага раёна, Кіеўскай вобласці.

У 1956 годзе пераехаў у Оршу і зараз працую настаўнікам сярэдняй школы.

Друкаваўся ў часопісах з 1955 г.

Незанаты.

Бацька, Караткевіч Сямён Цімафеевіч, персанальны пенсіянер, 1889 г. нараджэння; маці, Караткевіч Надзея Васільеўна, хатняя гаспадыня, 1893 г. нараджэння, і пляменніца, Караткевіч Раіса Валер'еўна, 1939 г. нараджэння, вучаніца, жывуць разам са мною ў г. Оршы, Віцебскай вобласці, па адрасу:

вул. Варашылава д № 10.

25 красавіка 1957 г.

Подпіс: Ул. Караткевіч

# Узнагароды



У.Караткевіч узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў;

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1983) за раман «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі»), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (1984, пасмяротна) за раман «Чорны замак Альшанскі».

# Экранізацыя




1979 г.




1984 г.




1967 г.

# Арыгінальна і непаўторна раскрыўся У. Караткевіч у наступных творах




**Караткевіч, У.** Быў. Ёсць. Буду : кніга паэзіі / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. — 157с., 8 л. іл.

**Гэта кніга паэзіі Уладзіміра Караткевіча (1930–1984), якую ён сам падрыхтаваў да друку. Аўтар пабачыць яе не змог, але ўдзячны чытач зноў сустрэнецца з выдатным майстрам, адным з самых дасведчаных пісьменнікаў нашага часу, таленавітым паэтам.**




**Караткевіч, У.** Дзікае паляванне караля Стаха : аповесці, апавяданні / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. — 511с. — (З вякоў мінулых).

**У славутым гатычным дэтэктыве «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Караткевіч стварыў незабыўны, таямнічы і загадкавы вобраз беларускай мінуўшчыны. Падзеі аповесці адбываюцца ў канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя. Вучоны-фальклярыст Андрэй Бялецкі трапляе ў маёнтак Балотныя Яліны, дзе становіцца сведкам незвычайных здарэнняў. Страх на ўсё наваколле наганяе дзікае паляванне караля Стаха, пад час якога быў забіты бацька Надзеі Яноўскай, сучаснай ўладальніцы маёнтка…**

**«Зямля пад белымі крыламі» – гэта сціплы і займальны аповед пра рэальную беларускую гісторыю.**




**Караткевіч, У**. Каласы пад сярпом тваім : раман / Уладзімір Караткевіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. — 814с. — (Бібліятэка школьніка).

**Адзін з найлепшых гістарычных раманаў у беларускай літаратуры. Чытач трапляе у магнацкі палац і сялянскую хату, у гімназічны клас і на велікасвецкі баль, і разам з галоўным героем рамана, Алесем Загорскім, адкрывае для сябе прыгажосць, веліч і трагедыю сваёй радзімы – Беларусі.**




**Караткевіч, У.** Нельга забыць : раман / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. — 335 с., іл.

**Раман прысвечаны жыццю творчай інтэлігенцыі. Аўтар падае сучасныя падзеі на гістарычным фоне. Праўнук беларуса Усяслава Грынкевіча, удзельніка паўстання 1863 года, сустрэў Ірыну Гораву, праўнучку рускага афіцэра Юрыя Горава, і пакахаў яе. Раман «Нельга забыць» вядомы таксама і пад назваю «Леаніды не вернуцца да Зямлі».**




**Караткевіч, У.** Хрыстос прызямліўся ў Гародні : раман / Уладзімір Караткевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 589 с. — (Бібліятэка школьніка).

**Гэта твор пра сярэдневякоўе, пра тыя змрочныя часы, калі наш народ знаходзіўся пад прыгнётам царквы і феадалаў.**




**Караткевіч, У.** Зямля пад белымі крыламі : нарыс / Уладзімір Караткевіч. — 2-е выданне. — Мінск : Народная асвета, 1992. — 192 с., іл.

**Гэта твор пра сярэдневякоўе, пра тыя змрочныя часы, калі наш народ знаходзіўся пад прыгнётам царквы і феадалаў.**





*Як жыць – дык жыць для Беларусі,*
*А без яе – зусім не жыць*

У.Караткевіч

**Паважаныя чытачы, калі Вас зацікавілі прадстаўленыя выданні на гэтай віртуальнай выставе, запрашаем к нам у Хоцімскую цэнтральную бібліятэку.**

# Дзякуй за ўвагу!